Зьміцер Санько

# А як па-беларуску?

## Прыказкі, прымаўкі, фраземы

*даведнік-мінімум*

Зьміцер Санько

# А як па-беларуску?

Прыказкі, прымаўкі, фраземы
*даведнік-мінімум*

Мінск
«Тэхналогія»
2016

УДК 811.161.1'373.4'374=161.3
ББК 81.2 Бел-4
С18

Выдадзена коштам
*Наталі, Яніны і Кастуся Санько*

**Санько, З.**
С18 А як па-беларуску? Прыказкі, прымаўкі, фраземы : даведнік-мінімум / Зьміцер Санько. – Мінск : Тэхналогія, 2016. – 16 с.
ISBN 978-985-458-269-6.

Рыхтуючы гэтую кніжку, аўтар меў на мэце паказаць хараство, адметнасць і багацце роднай мовы ў галіне выслоўяў.

Адрасуецца ўсім, хто імкнецца да чысціні сваёй гаворкі, да вобразнасці і трапнасці ў штодзённым маўленні.

**УДК 811.161.1'373.4'374=161.3**
**ББК 81.2 Бел-4**

**ISBN 978-985-458-269-6**

© Санько З., 2016.
© Афармленне. НВК «Тэхналогія», 2016.

Маім даражэнькім дзецям
гэтую кніжку прысвячаю
*Аўтар*

Бабушкины сказки
Плёткі старой цёткі

Без задних ног
Як пшаніцу прадаўшы

Без труда не вытащишь и рыбку из пруда
Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца

Без хозяина дом сирота
Няма Саўкі – няма ўпраўкі

Бережёного и бог бережёт
Хто сам сябе сцеражэ, таго і бог беражэ

Бестолковая голова ногам покоя не даёт
За дурной галавою і нагам няма спакою

Богат Ермошка: завёл кота да кошку
Багаты Хадот: сабака ды кот

Богатому черти деньги куют
У каго дабро вядзецца, у таго і певень нясецца

Бог не выдаст, свинья не съест
Калі бог не дасць смерці, дык не возьмуць і чэрці

Будет и наше время
Загляне сонца і ў наша ваконца

Был бы хлеб, а зубы сыщутся
Абы хлеб быў, а мышы збягуцца

Был конь, да изъездился
Быў хлеб, ды з'едзены, быў конь, ды з'езджаны

Было дело, да не было деда
Быў квас, ды не было вас

В гости со своим самоваром не ходят
У студню вады не ліюць, а ў лес дроў не вязуць

Век долог – всем полон
Здараецца на вяку і па спіне і па баку

Век живи, век учись
Што жывем, то вучымся

Велика Федора, да дура
Вырас пад неба, а дурань як трэба

Видит око, да зуб неймёт
Бачыць вока, ды ляжыць высока

Визга много, а шерсти нет
Шмат дзіва, але мала мліва

В каждой шутке есть доля правды
Жарты нічога не варты, але часам праўдзяцца

В ногах правды нет
Ногі для дарогі

В огороде бузина, а в Киеве дядька
Хто пра хату, а хто пра лапату

В один присест
За адным заседам

Вор ворует не для прибыли, а для своей погибели
Калі хочаш прапасці, пачні красці

Воровское стяжанье впрок не пойдёт
Чужое не тучыць, бо сумленне мучыць

Вот тебе и на
Вось табе і маеш

Все кузни исходил, да не кован воротился
Вакол крам ды зноў к нам

Всем сестрам по серьгам
Кожнай сястрыцы па завушніцы

В семье не без урода
Няма роду без выроду



Всяк молодец на свой образец
У кожнага кавалера свае манеры

Всякому овощу своё время
Будзе час – будзе і квас, не ўсё за раз

Всяк петух смел на своей навозной куче
У сваім гародзе роўны ваяводзе

Всяк сверчок знай свой шесток
Ведай, каток, свой куток

В тесноте, да не в обиде
Дзе цесна, там пацешна

В чужом глазу сучок видит, а в своём бревна не замечает
Чужыя грахі перад вачыма, а свае за плячыма

Выеденного яйца не стоит
Гарэлага шэлега не варты

Выкрасить да выбросить
На лапату ды за хату

Вышел сухим из воды
Пабыў у вадзе і не мокры нідзе

Где много слов, там мало дела
Языком у Вільні, а галавой за печчу

Где тонко, тут и рвётся, где худо, тут и порется
Дзе коратка, там рвецца, дзе балюча, там б’ецца

Глазам видно, да ногам обидно
Блізка відаць, ды далёка дыба́ць

Говорят, что кур доят
Кажуць, што масла хлебам мажуць

Голодной куме хлеб на уме
Галоднай курцы проса на думцы

Гора родила мышь
З вялікае хмары малы дождж

Грехи любезны доводят до бездны
Не заглядайся на чужых жонак: не скасееш,
дык здурнееш

Гром не грянет – мужик не перекрестится
Як трывога, тады да бога

Гулять смолоду – умирать под старость с голоду
Хто замоладу не працуе, той на старасць жабруе

Два сапога пара
Абое рабое

Двое дерутся – третий в выигрыше
Дзе двух зваду вядзе, там трэці крадзе

Двум смертям не бывать, а одной не миновать
Што будзе, то будзе, а дзве смерці не будзе

Делай дело не спеша, была бы слава хороша
Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра

Делу – время, потехе – час
Перш папрацуй, а тады і патанцуй

Долг платежом красен
Што вінен, аддаць павінен

Дорог не обед, а привет
Ці з перцам, ці не з перцам, абы са шчырым сэрцам

Дорого, да мило, дёшево, да гнило
За тавар гнілы і грош малы

До свадьбы заживёт
Пакуль жаніцца, усё загаіцца

Доход не живёт без хлопот
Пільнуй гаспадаркі – будуць у гаршку скваркі

Дружба дружбой, а денежки врозь
Сваяк сваяком, а грошыкі не радня

Дурака пошлёшь, а за ним и сам пойдёшь
Пашлі дурнога, а за ім другога

Дурак набитый
Боўдзіла дурное

Дыма без огня не бывает
Дзе не гарыць, там і не курыць



Если бы да кабы выросли во рту грибы
Каб на дзятла не стралец, быў бы дзяцел маладзец

Если кажется, нужно перекреститься
Здаецца, што і певень смяецца

Ешь – потей, работай – мёрзни
Як да чаркі – скоры, як да працы – хворы

Ещё такой не родился, кто бы всем сгодился
Яшчэ гэткі не спаткаўся, каб усім спадабаўся

Жди у моря погоды
Сядзі ў бу́дзе і чакай, што будзе

Жизнь прожить – не поле перейти
Век звекаваць – не пальцам паківаць

Закон, что дышло: куда повернул, туда и вышло
На рынку долі не купіш, а ў судзе праўды не знойдзеш

За двумя зайцами погонишься – ни одного не поймаешь
Хто зашмат жадае, той нічога не мае

Задним умом крепок
Розум прыходзе па шкодзе

За копейку удавится
За рубель жабу да Барысава дубцом пагоніць

Запас карман не дерёт
Хто жыве без запасу, той гіне без часу

За семь вёрст киселя хлебать
За лыжку яды сем міляў хады

Заставь дурака богу молиться – он и лоб расшибёт
Скажы дурному паклоны біць, то ён і лоб паб’е

Из грязи да в князи
Не дай бог свінні рог, а мужыку панства

Из одного теста
Чэрці адной шэрсці

Или полковник, или покойник
Ці пан, ці прапаў

И мы не лыком шиты
І мая доля не шчарбатая

И на старуху бывает проруха
Конь на чатырох, і той спатыкаецца

Искры из глаз посыпались
Аж зоркі ўваччу заскакалі

Кабы не дыра во рту – жил бы жил, ни о чём не тужил
Каб не ежка ды не адзежка, была б грошай поўная дзежка

Кабы свинье рога, всех бы со свету сжила
Каб свінні рогі, нікому б не было дарогі

Как аукнется, так и откликнется
Як гукнеш, так і адгукнецца

Как корове седло
Як свінні завушніцы

Как мёртвому припарки
Як хваробе кашаль

Как ни в чём не бывало
Як нічога ніякага

Какова пава, такова ей и слава
Якая дзеўка, такая ёй і прыпеўка

Каков вопрос, таков и ответ
Якое пытанне, такое адпавяданне

Каково семя, таково и племя
Якое карэнне, такое і насенне

Каков поп, таков и приход
Якая рада, такая і грама́да

Когда рак на горе свистнет
Як воўк шчанём будзе і брахаць хвастом будзе

Копейка рубль бережёт
Жменя да жмені – будзе поўная вярэня

Кот наплакал
З жабіны прыгаршчы



Кто ищет, тот найдёт
Хто пытае, той не блудзіць, хто шукае, той знаходзіць

Кто сам себя хвалит, в том пути не бывает
Хто сябе хваліць, няхай таго пярун спаліць

Куда конь с копытом, туда и рак с клешнёй
Каваль каня куе – і жаба нагу дае

Лёгок на помине
Мы пра цыганку, а яна на ганку

Лентяй за дело – мозоль на тело
Як прывык да лянасці, то ад працы баляць косці

Лес рубят – щепки летят
Дзе дровы сякуць, там трэскі лятуць

Летами ушёл, да умом не дошёл
Век зжыў, а розуму не нажыў

Лоб широк, да ума мало
Галава – з лу́бку, а розуму – з бубку

Ложка дёгтя портит бочку мёда
Кропля смуроду псуе гарнец мёду

Лучше один раз увидеть, чем сто раз услышать
Вер не сказу, а паказу

Лучше плохо ехать, чем хорошо идти
Хоць дрогка, ды нагам лёгка

Лучше по миру собирать, чем чужое брать
Лепей дадзенае, чымся крадзенае

Лучше синица в руках, чем журавль в небе
Лепей плотка ў руцэ, чым бялюга ў рацэ

Любопытной Варваре нос оторвали
Цікаўнай Амілі нос прышчамілі

Мал золотник, да дорог
Талер маленькі, а даражэнькі

Малые дети – малая печаль, большие дети – большая печаль
Малыя дзеці спаць не даюць, а вялікія жыць не даюць

Медведя не убил, а шкуру запродал
Яшчэ не злавіў, а ўжо скубе

Мели, Емеля, твоя неделя
Мялі, Апанас, цяпер твой час

Милые бранятся – только тешатся
Хто каго любіць, той таго чубіць

Москва не сразу строилась
Не за дзень Вільня станавілася

Моя хата с краю – ничего не знаю
За чужым плотам – не мой клопат

Мягко стелет, да жёстко спать
Добра гаворыць, ды нядобра творыць

На безрыбье и рак рыба
Як няма мяса, то і грыб закраса

На бога надейся, а сам не плошай
Божа памажы, але і сам падбяжы

На вкус и цвет товарищей нет
Што дзеду міла, то ўнуку гніла

На воре шапка горит
Хто парася ўкраў, таму ўвушшу вішчыць

На нет и суда нет
Як няма, то і дарма

На ночь глядя
Проці ночы

На пузе шёлк, а в пузе – щёлк
На назе бот рыпіць, а ў гаршку трасца кіпіць

Насильно мил не будешь
Не памогуць і чары, як каму хто не да па́ры

На то и щука в море, чтобы карась не дремал
На тое і каты́, каб мышы лататы

На урода всё неугода
Благой благаце блага і на куце



На чужой каравай рот не разевай
Не будзь ласы на чужыя каўбасы

На чужой роток не накинешь платок
Няма тае хусты, каб завязаць людзям вусты

Не было печали, так черти накачали
Не мела баба клопату, купіла парася

Не всё коту масленица
Не заўсягды як на Дзяды

Не дай бог
Барані божа

Не до жиру, быть бы живу
Не да каляды́, калі поўна хата бяды

Незваный гость хуже татарина
Прыйшоў нязваны і ідзі нягнаны

Не откладывай на завтра то, что можно сделать сегодня
Адклад не ідзе ў лад

Не ошибается тот, кто ничего не делает
Той не памыляецца, хто ад працы хіляецца

Не плюй в колодец – пригодится воды напиться
Не плюй у крыніцу – прыйдзеш па вадзіцу

Не ровён час
Няўрокам кажучы

Не смейся чужой беде, своя нагряде
Не радуйся чужой бядзе, бо свая ззаду ідзе

Ни за что ни про что
Без дай прычыны

Ни к селу ни к городу
Ні да рады ні да звады

Обещанного три года ждут
Абяцанкі-цацанкі, а дурню радасць

Одно нынче лучше двух завтра
Сёння зробіш – заўтра як знойдзеш

От горшка два вершка
Кату па пяту

От смерти нет зелья
Ад старасці і смерці няма лекаў на свеце

От тюрьмы да от сумы не отрекайся
Ад астрогу няма засцярогу

Пар костей не ломит
Ад цяплосці не баляць косці

Первый блин комом
Першае цялятка – шчанятка

Перед смертью все равны
Магіла ўсіх памірыла

Пир на весь мир
Банкет на ўвесь свет

Пить да гулять – добра не видать
Балі ды гулі і пана разулі

Пить – ум пропить
Ад гарэлкі розум мелкі

Позднему гостю – кости
Хто позна ходзіць, той сам сабе шкодзіць

Попытка не пытка, а спрос не беда
Спроба не хвароба

После дождичка в четверг
На тое лета, пасля абеда, гэтакай парою

Правда всегда перетянет
Усё мінецца, а праўда застанецца

Придёт беда – купишь ума
Бяда дакучыць ды розуму навучыць

При царе Горохе
За каралём Гарохам, як людзей было троху

Пришла беда – отворяй ворота
Бяда па бядзе як па нітачцы ідзе



Проголодаешься – хлеб достать догадаешься
Грошы не неба – дастанеш, як трэба

Пуганая ворона куста боится
Ратаваны з вады конь і лужыны баіцца

Пустился в драку – головы не жалей
Як пайшоў у сварку, то не шкадуй карку

Пьян как сапожник
Хапіў з дзежкі, што не бачыць сцежкі

Работа не волк, в лес не убежит
У бога дзён многа – паробім

Рука руку моет
Нага нагу падпірае, рука руку абмывае

Рыбак рыбака видит издалека
Сарока сароку бачыць здалёку

Свяжись с дураком, сам дурак будешь
З дурнем счэпішся – дурнем зробішся

С глаз долой – из сердца вон
З ваччу сышоў – і з памяці зваліўся

Сделал дело – гуляй смело
Скончыў работу – гуляй у ахвоту

Седина в бороду – бес в ребро
Волас сівее, а галава шалее

Семь раз отмерь – один отрежь
Без меры няма веры

Сказка про белого бычка
Казаная казка

С кем поведешься, от того и наберёшься
З якім спазнаешся, такім станешся

Сколько волка ни корми, всё равно в лес смотрит
Як чорта ні хрысці, усё адно: «У балота пусці»

Сколько ни жить, а смерти не отбыть
Колькі ні красуйся, усё туды гатуйся

Слезами горю не поможешь
Плач, галасі, а рады не дасі

Смелость города берёт
У каго адвага, у таго і перавага

Смерть за воротами не ждёт
Смерць і радзіны не выбіраюць гадзіны

Смех без причины – признак дурачины
Па латках пазнаць скупога, а па смеху – дурнога

Снявши голову, по волосам не плачут
Прапала кароўка, прападай і вяроўка

Солдат спит – служба идёт
Кухар спіць, а суп кіпіць

Терпенье и труд всё перетрут
Рабі пільна – і тут будзе Вільня

Труд человека кормит, а лень портит
Праца гадуе, а гультайства марнуе

Тяп да ляп
Стук, грук, абы з рук

У дурака дурацкая и речь
У дурнога пеўня дурная песня

Улита едет – когда то будет
Пакуль тое настане, і нас з табой не стане

Умелые руки не знают скуки
Хто працуе, той не сумуе

У семи нянек дитя без глаза
Дзе нянек многа, там дзіця бязнога

Услужливый дурак опаснее врага
Дурная помач горай за немач

У страха глаза велики, да ничего не видят
Хто баіцца, таму ўваччу дваіцца

Утопающий за соломинку хватается
Калі топішся, і за касу хопішся



Утро вечера мудренее
Пераначуем, то болей пачуем

Ученье – путь к уменью
Без навукі як бязрукі

Хорошему всюду хорошо
Добраму чалавечку добра і ў запечку, а ліхаце дрэнна і на куце

Хорош кус, да не для наших уст
Бачыць котка лой, ды не ёй

Хоть лыком шит, а всё же муж
Мужык як варона, ды ўсё жонцы абарона

Хоть отбавляй
Хоць гаць гаці

Хоть шаром покати
Ні ўзяць ні ўцяць

Христом-богом молить
Напрамілы бог прасіць

Цыплят по осени считают
Не хваліся сеўшы, а хваліся з'еўшы

Чего сам не любишь, того и другому не желай
Не рабі другому, што не люба самому

Человек предполагает, а господь располагает
Чалавек маракуе, а бог выракуе

Чему бывать, того не миновать
Што суджана, тое не будзе адгуджана

Что ни день, то новость
Што гадзіна, то навіна

Что посеешь, то и пожнёшь
Кінь за сабою, знойдзеш перад сабою

Что у кого болит, тот о том и говорит
Што каму дапякае, той пра тое і гукае

Что хочу, то и ворочу
Як хачу, так і кручу

Чужую беду руками разведу
Чужую бяду на пальцах развяду, а да свае розуму не прыкладу

Шёл бы воевать, да лень саблю вынимать
І я б касіў, каб хто касу насіў

Шила в мешке не утаишь
Грэх не схаваеш у мех, не ўтопчаш у балота

Шутил Купряшка, да попал в тюряжку
Жартаваў воўк з канём, ды ў жмені зубы панёс

Язык до Киева доведёт
Язык Вільні дапытае

Язык мой – враг мой: прежде ума рыщет
Языча, языча, які чорт цябе кліча?

Я про Фому, а он про Ерёму
Я яму пра абразы, а ён мне пра гарбузы


Даведкавае выданне

**Санько** Зьміцер

*А як па-беларуску?*

Прыказкі, прымаўкі, фраземы
Даведнік-мінімум

Рэдактар *Марыя Кавальчук*. Мастацкае афармленне *Віталь Катовіч*.
Тэхнічны рэдактар *Алесь Дрыбін*. Карэктар *Марыя Журавель*.
Кампутарнае шыхтаванне *Уладзя Бурымская*

Падпісана да друку 31.03.16. Фармат 60×90 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура SchoolBook.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,00. Ул.-выд. арк. 0,8. Наклад 2000 паас. Замова № 1680.
НВК "Тэхналогія". Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў № 1/379 ад 01.07.14.
Вул. Ляўкова, 19, 220007, Мінск. Тэл./факс (017) 327-19-40. E-mail: technalohija@gmail.com

Паліграфічнае выкананне: УП «Данарыт». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў № 2/108 ад 07.04.2014.
Вул. Кастрычніцкая, 25, 220030, Мінск. Тэл. (017) 389-73-00. www.donarit.com



## Зьміцер Санько

Мовазнавец, выдавец. Аўтар кнігі “Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем” (Менск, 1991). Супольнік Працоўнай групы для ўнармавання беларускага класічнага правапісу (“Беларускі клясычны правапіс: Збор правілаў. Сучасная нармалізацыя”. Вільня; Менск, 2005).

Укладальнік кніг “Маленькі маскоўска-беларускі (крывіцкі) слоўнічак фразэолёгічны і прыказкаў ды прывітаньні, зычэньні і інш.” Я. Станкевіча (пры ўчасьці Ант. Адамовіча) (Менск, 1992), “Русіфікацыя беларускай мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу” С. Станкевіча (Менск, 1994).

Выдавец факсіміле газет “Наша Доля” (1906 г.), “Наша Ніва” (1906–1915, 1920 гг.), “Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка” В. Ластоўскага (1924 г.).

Узнагароджаны медалём Францішка Скарыны (1990), лаўрэат літаратурнай прэміі імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра (2011).

Тэхналогія

ISBN 978-985-458-269-6

9 789854 582696